POCZTA OPŁACONA RYCZAŁTEM. АДЗІН № КАШТУЕ 35 ГР.

№ 4. | 5 | СЕРАДА 4-га САКАВІКА 1925 Г. Год II.

ДВАТЫДНЁВІК САТЫРЫ, ЖАРТАЎ І СЬМЕХУ.



-Чаму гэта, пане начальніку, беларусоў не прыймаюць на службу?

-Бо гэтыя „хамы" адзін за трох працуюць, дык ніводзін з нашых ня вытрымае рэдукцыі.

§§

КОЛЬКІ СЛОЎ ДА ГР. ЧЫТАЦОЎ.

Паважаныя Грамадзяне! Хоцучы, што раз-то болей, узбагаціць, як самы воблік „Авадня", так і зьмест яго, з гэтага нумара уводзім рысункі-і шаржы.

Пры дапамозе гэткіх сіл, як Я. Драздовіч, Л. Дутка, Бусько, Я. Мал. А. В. ды інш., спадзяёмся стварыць цэлую галерэю крывічоўска-беларускіх дзеячоў і знамянітасьцяў.

Наш „АВАДЗЕНЬ" ужо неўступае нат заграніčным выданьням, бо часта на выстаўцы у газэтчыкаў займае першае мейсца.

Дык гуртуйцеся, браты, каля сваей люстраванай і цікавай газэты! Няхай жыве „АВАДЗЕНЬ" і яго чытачы ды падпішчыкі, асабліва-Г А Д А В Ы Я!

РЭДАКЦЫЯ.

§§

„АВАДЗЕНЬ" моцна гудзеў, як у вёску ён ляцеў...

Месяц Люты, але цёпла:
Рэкі ўсе цякуць,
На дварэ аж надта добра-
Птушкі скора прылятуць.
І ня дзіва гэта, птушкі,
Аджылі вось, нат, і мушкі:
„АВАДЗЕНЬ" моцна гудзеў,
Як у вёску ён ляцеў.

Вось, у хаце мы збіралісь
Многа надта насьмяялісь,
„АВАДНЯ" як мы чыталі-
Нат вачамі ня міргалі.
А каб болей прылятаў
Ды нас гэдак пацешаў,
Грошы у вескы мы збіраем
І падпіску пасылаем.

Пастравы. П. Б.

Як Моўша купіў цялё...



Глядзеў месяц
І сьмяяўся,
Па цялё як
Моўша краўся.



2. Ішоў напэўна
Ні лянуўся,
Бо ўжо з цацой
Згаварыўся.



3. І бяз клопату,
Бяз мукі,
Браў цялё
Нарэшце ў рукі.

4. А купец
Каб не марудзіў,
Пагранічным
Грышка спудзіў.

5. А пасьля
Памог падняці,
А сам драла
Уцякаці.

6. Моўша ураз-жа
Як прыгнууся,
Ажно дома
Апынуўся.

7. Сора з дзеткамі спаткала
Мяшок зараз развязала...

8. Аж сьвіньня, замест цяляці
Моўша гвалту стаў крычаці...

0000000000000000000000000000000000000000000000000000000000000000

ЗАГАДКІ.

1. Што расьцець без караня?
2. Дзяцёнак плача, чалавек пытаецца:
   - Чаго плачэш?
   - Ты мне бацька, а я табе ня сын...
3. Зьверху дзірка, знізу дзірка, збоку дзірка, а пасярод-агонь ды вада.
4. Хто бачыць таксама з пераду, як і ззаду?

б...в.

УВАЖЛІВЫ СЫН.

Два сыны і бацька ішлі разам па лугу ды натрапілі на роў з вадой, даволі шырокі. Вось бацька разагнаўся і спрытна пераскочыў на другі бок. Малодшы сын дзівіцца і кажа: - Глядзі, наш бацька скача, як сабака! - а старэйшы на гэта: - Ці ж на бацьку можна казаць гадак?!
Скача, - Няхай скача, чорт яго бяры!

Пашырайце АВАДНЯ паміж сваіх блізкіх і знаёмых.



-Панок!..Пана сабака зьела мае 5 кілбас...

-Нічога,нічога бабка,-яму гэта ні зашкадзіць.

Аб курсах.

-Ці будуць курсы,аб якіх усё піша „Грамадзкі Голас?"

-А,як-жа,будуць...

-А калі?

-Гм...Аб гэтым запытайся у „Прасьветы."

Г..ч.

На судзе.

Судзьдзя.-Ці хцэце ,жэбы справа была уможона?

-?..

Судзьдзя.-Як-жа да вас мувіць?

-Па беларуску.

Судзьдзя.-Гм...Ну,хотите,чтобы дѣло ваше было окончено?

-?..

Судзьдзя.-Вы не зрозумелі?..Як жа вам вытлумачыць?..

-Па нашаму,па беларуску, пане судзьдзя.

Г...ч.

У в э т э р ы н а р а.



-Ну,дык вось чалавеча,па усім сьвеце ходзіць мор на быдла...

-Каб хоць пана доктара Бог захавау у здароуі!

Вушы у н а г а х.

-Ну,а як тамака ваш новы пан?Добры?

-Нічога сабе,толькі бяда, што мае В У Ш Ы у нагах.

-Якім жаж,гэта,парадкам?

-А так:калі гаворучы да яго не пахілішся ажно да каленЬ,дык нічагусенькі ня чуе.

|Са стар.друк,



SKRYŬDZIŁA CHŁAPCA.

Raz idzie dziaŭčyna z pola
I piesni spiewaje
A zawuć jaje Antola.
Dzieŭka nie ďurnaja.

Pozna končyła na poli
Šnur baranawaci,
Dyk kabyła jdzie pawoli
Čuć moža stupaci.

Až chłapiec z susiedniaj wioski,
Jaje nahaniaje.
Paraŭniaŭšysia z joj troški
Zaraz zaŭynaje.

–Oho! Niechta pastaraŭzia
(Hlanuŭšy wakoła),
–Z taboj chtoś pacaławaŭsia
Bo nieimi-ž wiasioła!

A dziaŭčyna čuć-čuć zudzie:
–Pan Haŭrył žartuje,–
Ciž to toj wiasiołym budzie,
Jak chto pacałuje?

–Ato woš, maje kabyła
Sumna paziraje...
Haławu, bačyš, spuściła
I čuć, čuć kłypaje...

–Chaj Antolačka sprabuje,
Sposab praŭdziwiejšy,
Kali tolki pacałuje
Chłapiec maładziejšy.

A chłapiec dumaŭ pawoli
Woś dumku takuju,
„Oj, siahońnia je Antoli
U hubki pacałuju!"

A jana sabie ničoha
Taho nie zważaje
–Dobra, što ad małdoha
Hedak pamahaje!

I tak kaza, woś, Haŭryłu:
Kali pan umieje–
Pacałuj maju kabyłu,
Mo pawiesialeeje!..

S. Krapiwa.





ЯЗЭПАУ СЫН.

Язэпаў сын Язэпам зваўся,
Быў у бацькі ён адзін
І да бацькі надта удаўся,
Як з таго-жа дрэва клін.
У дзеўках рана ён кахаўся
І гарэлку навет піў.
На прыпеўках троху знаўся,
Іх да складу гаварыў.
Дый спрытнасьць у ім зьявілась
Тут сядзіць, а бачыць там
Дзе, калі і што зрабілась
Ён праўдзіва скажа вам.
....
Раз так матцы за абедам
Ляпнуў з прастаты:
Мама, помніш, як з суседам
Цалавалась ты?
Госьці змоўклі, але бацька
Пасварыў рукой,
А матка крычыць зьненацка:
-Ах ты, хаўжык, мой!
Бацька раз, на імяніны,
Шмат гасьцей сабраў.
Частаваў ды у тры гадзіны
У карты абыграў.
У момэнт той, як ён пусьціўся
Выйгрыш свой зьбіраць,
Рантам сын яго зьявіўся
Ды стаў рагатаць.
І крычыць: „Ура, матулька!
Ура, сьвята ўсім!
Усіх абчысьціў наш татулька,
Усіх гасьцей саўсім!
Я ўсе з ранку гэта бачыў
Ў шчэлку паглядаў,
Як ён карты хварбай значыў,
Як іх падкладаў!
Змоўклі усе-бацька трасецца
Бедны, сам ня свой...
Не сваім сьмехам сьмяецца:
-Ах ты, злодзей мой!"
"Усіх знаемых, сваявольна,
Колець балаўнік.
Адзін раз і я няволька
Стаў прад ім ўтупік...
Стоючы блізка ля бацькі
Ён гасьцям сказаў:
-Піша песьні гэты дзядзька,
Я-ж іх чытаў.
Ён сьмешнымі выстаўляе
Адных бедных мужыкоў
Быдта-бы у нас не хапае
Бязлепіц-паноў.
Вось, наш войт і з мэдалямі,
Важна так крычыць,
А у гміне за дзялам
Пьян заўсёгды сьпіць.
Вот такога то спрыцяку
У вершах прапішы,
Будзеш шчыру мець падзяку
Хоць не барышы!"
.... С----в.

§§§

„Cymus" sa starych drukau.

Žonka da muža: "ach ty, pjanica! Jak ty možaš tak mnoha harełki pić?

- Nie zabywaj, što ja paŭtara hady adnym małakom žyŭ.

- Kali-ž heta było? Što ty brešaš!?

- A jak u kałysce byŭ.

Byŭ pry pamiaci...

Doktar: - Kali chwory byŭ jašče pry pamiaci?

Udawa: (płačučy). - Na hadzinu pierad śmierciaj.

Doktar: - A pa čym wiedajecie, što jon byŭ pry poŭnaj pamiaci?

Udawa: - Jon abłajaŭ was i wašaje lakarstwa.

Suddzia (da padsudnaha) - Čaho-ž ty pryjšoŭ siudy z kałom?

Padsudny. - Mnie adwakat moj zahadaŭ, kab ja zabraŭ u sud „sredstwy swajej abarony".

XXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXXX

PRYPAMINAJEM pawažanym čytačom, što para abnawić PIERADPŁATU dy PRYSYŁAĆ NA DRUHI KWARTAŁ HROŠY! Tarapiciesia!!!



У ВІЛЬНІ.

Газэтчык |крычыць|:- Авадзень!..Авадзень!..Ава---дзень!..
Паненка |с перапуду|- А,Божа,скуль-жа ён узяўся?..Уцякаймо хутчэй, бо яшчэ на нос сядзе...

Л. М а л а н к а.

У канцэлярыі.

Начальнік, де канцэлярыі грышоўшы, круціць носам.
Панове, што тут у вас за смрод?
- з браку добрай табакі курым самасейку, пане начальнік!, -адказвае падуладны.

чэж.

СІМВОЛ.

У школе, на лекцыі Закону Божага духоўный айцец пытаецца:
-Хто ведае, што абазначае слова „СІМВОЛ".
Усе маўчаць, а жыдок падымае руку...
-Ну-ткі, скажы.
-С І М- гэта так сабе, а В О Л -то гэта біх.

ВОСЬ АД ЧАГО.

Як у царкві стары дзяк
Ужо засьпявае,
Стара баба у кутку
Плача ды уздыхае.
Як угледзіў гэта дзед
Да яе дабраўся
-„Чаго плачэце вы так?"
Стару запытаўся.
-Ой, бо як-жа мне ня плакаць!
"Яму баба кажа
-"Бо цяпер мне голас ваш
"Аж за сэрца вяжа!
„Так, калісь, мая каза
„На ляду крычала
„Як яе там зьвярына
„Бедну разьдзірала!"

Падкў Дык-Дзеля.

У ДОКТАРА.



ДОКТАР.-Дзе вас гэдак данялі?..
ХВОРЫ. -А гэта яшчэ памятка нападу на "Грамадзянскае Сабраньне"..

Янка М.

ФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФФ

На станцыі.

Падарожны-жыдок просіць кандуктара разтлумачыць яму,што абазначаюць літэры на вагоне:К.Б.ж.д.

Той насьмешліва адказвае:

-Гэта абазначае-какая безтолковая жыдоўская дорога"..

-Не,-запярэчыў жыдок,-жыдоўская то і чытаць трэба па жыдоўску:

-Дурэнь жыдае быць кандуктарам."

Знаёмы.

Пара ужо падумаць аб падпісцэ на другі квартал...

НАША ПОЧТА.

Падпіску на "АВАДНЯ" маем: па 1зл.80гр.ад гр.гр.Левіна,Ковальчыка,Кляўсуця,Кучука,Зыбайло, Бохана,Крыжаноўскага,Фурса.Вінцукевіча,Конона П.,Казлоўскага, Петрусэвіча,Шчэцька,Падгайскага, Яроцэвіча,Валентовіча,Шэвцыка, Паўловіча,Говора;ад Ілюкевіча1зл. ад Беленко 1зл.50гр.Па 2зл.прыслалі Бовтрэль,Корсак,Пагуда,Кабута,Плаўскі,Гриневіч-кампанытар, Бабровіч,Бараноўскі,Калюцік.па 3 зл.=Дожын,Война-хоўскі,Кулак;па 3 зл.50гр.ад гр.Абрамовіча,па 3зл. 60гр.прыслалі гр.гр.Шырко ... 7 зл.ад П.Пугоўкі.

Усім падпішчыкам "АВАДЗЕНЬ" пасылаецца акуратна.

Атрымана 7зл.50 гр.АХВЯРЫ ад гр.Гапановіча-рэдакцыя шчыра дзякуе.

Гр.МАТЭШУКУ-Вам "Авадня" высылаем ад №1 акуратна,"пытайцеся на почце.

Гр.гр.Захару Борка,Журкевічу, Кейзіку,для Б.Ш:пасылаем пробныя №№ і чакаем падпіскі.

Цяпер,на астатку,даем агульны адказ тым нязлічоным асобам, якія просяць дарма ім прысылаць газэтку:-Занадта,браточкі,Вы прывыклі да дармаўшчынкі.Пры усей нашай ахвоце цешыць вас добрай, люстраванай газэткай-"АВАДНЕМ" ня хочэм псуваць Ваш характар...

Толькі пробныя нумары высылаюцца дарма.

Я.Быліне,Знаемаму,гр.з Крулеўшчыны,Бусьца і Дутцы за прысланыя творы і рысункі дзякуем, стараемся у пэласьці карыстаць.

РЭДАКЦЫЯ.

Разгадкі:1.Чалавек.2.Бо дачка. 3.Самавар.4.Сьляпы.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі-Wilno Завальна 7,пры кнігарні.

ПАДПІСКА:на 3 м.1зл.80гр.,на паўгода-3зл.50гр.,на год-7зл.усяго. За граніцуна год-тры даляры.

Рэдактар-Выдавец А.Васілеўскі.

Літ.Маца,вуліца Домброўскага 3,у ВІЛЬНІ.